**Вучэбная дысцыпліна «Сінтаксіс»**

| | |
|---|---|
| **Месца дысцыпліны ў структурнай схеме адукацыйнай праграмы** | Адукацыйная праграма бакалаўрыята (агульная вышэйшая адукацыя) Спецыяльнасць: 6-05-0232-01 Беларуская філалогія Цыкл спецыяльных дысцыплін: дзяржаўны кампанент* Модуль «Сучасная беларуская мова» |
| **Кароткі змест** | Прадмет і задачы сінтаксісу. Словазлучэнне як непрэдыкатыўная сінтаксічная адзінка. Сказ як прэдыкатыўная сінтаксічная адзінка. Галоўныя члены двухсастаўнага сказа. Дзейнік. Выказнік. Даданыя члены сказа. Азначэнне. Даданыя члены сказа. Дапаўненне і акалічнасць. Аднасастаўныя сказы. Няпоўныя і нячленныя сказы. Парадак слоў у сказе. Аднародныя члены сказа. Адасобленыя члены сказа. Параўнальныя канструкцыі. Зваротак. Пабочныя і ўстаўныя канструкцыі. Складаны сказ. Складаназлучаны сказ. Складаназалежны сказ. Складаназалежны сказ з некалькімі даданымі часткамі. Бяззлучнікавы складаны сказ . Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі. Спосабы перадачы чужой мовы на пісьме. Складанае сінтаксічнае цэлае. Пунктуацыя. |
| **Фарміруемые кампетэнцыі, вынікі навучання** | Базавыя прафесійныя кампетэнцыі: **ведаць:** класіфікацыю словазлучэнняў паводле розных прымет; віды паратаксічнай і гіпатаксічнай сувязі; тыпы аднасастаўных сказаў; класіфікацыю простых сказаў паводле розных прымет; класіфікацыю складаных сказаў паводле розных прымет; асноўныя паняцці сінтаксісу беларускай мовы; умовы і формы маўленчай камунікацыі; **умець:** выконваць поўны сінтаксічны разбор словазлучэнняў; карыстацца моўнымі паняццямі і тэрмінамі ў іх сістэмна-структурных сувязях; выконваць поўны сінтаксічны разбор сказаў; выяўляць і аналізаваць сінтаксічныя адзінкі ў мастацкіх тэкстах; карыстацца асноўнымі відамі сінтаксічнага аналізу; карыстацца навуковай, даведачнай і метадычнай літаратурай па беларускім мовазнаўстве.<br>БПК-1 – тлумачыць арганізацыю сістэмы сучаснай беларускай мовы на ўсіх яе ўзроўнях і правілы функцыянавання адзінак беларускай мовы ў маўленні.<br>БПК-2 – характарызаваць адзінкі беларускай мовы з боку іх семантыкі, структуры, функцыі, нарматыўнасці.<br>БПК-3 – ажыццяўляць паўзроўневы лінгвістычны аналіз беларускамоўнага тэксту.<br>БПК-4 – ажыццяўляць прафесійныя камунікацыі з выкарыстаннем тэрміналагічнага апарату беларусістыкі. |
| **Прэрэквізіты** | Фанетыка, лексікалогія, марфалогія. |
| **Працаёмкасць** | 6 заліковых адзінак, 260 акадэмічных гадзін, з іх 128 аўдыторных: 68 гадзін лекцый і 60 гадзін практычных заняткаў. |
| **Семестр(ы), патрабаванні і формы бягучай і прамежкавай атэстацыі** | 6-ы семестр, залік;<br>7-ы семестр, экзамен. |